ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
12
ЛІСТАПАДА
АЎТОРАК
№ 30 (1480)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

## Сардэчна вітаем дэлегатаў IV партыйнай справаздачна-выбарнай канферэнцыі!



*З кожным днём усё актыўней разгортваецца ва універсітэце абмеркаванне праектаў новай рэдакцыі Праграмы КПСС, Статута КПСС з прапануемымі змяненнямі. Ход абмеркавання перадз'ездаўскіх дакументаў сведчыць аб гарачай падтрымцы ў калектыве курсу партыі на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны для дасягнення якасна новага стану савецкага грамадства.*

***НА ЗДЫМКУ:** загадчыкі кафедраў грамадскіх навук, прадстаўнікі таварыства «Веды» у партыйным камітэце універсітэта абмяркоўваюць план прапаганды перадз'ездаўскіх дакументаў.*

*Фота А. ВАЛОШЫНА.*

## Беларускі універсітэт ТЭЛЕТАЙП
*ЎЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### 80-ГОДДЗЮ

першай рускай рэвалюцыі была прысвечана навуковая канферэнцыя, якую арганізавала кафедра гісторыі СССР дасавецкага перыяду. З уступным словам выступіў загадчык кафедры прафесар І. В. Аржахоўскі. Свае даклады прапанавалі выкладчыкі і студэнты.

С. ПОЗНЯК,
дацэнт.

### УСЕСАЮЗНАЯ АЛІМПІЯДА

«Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» чацвёрты год запар праводзіцца на базе факультэта прыкладной матэматыкі. 18—23 лістапада пройдуць спаборніцтвы па праграміраванню і ЭВМ.

Для ўдзельнікаў алімпіяды будзе арганізавана выстаўка навуковай і метадычнай літаратуры.

А. ДАНІЛЬЧАНКА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

### СУСТРЭЧА З МІНІСТРАМ

юстыцыі Беларускай ССР Я. А. Чканікавым адбылася на юрыдычным факультэце. Міністр пазнаёміў прысутных са становішчам спраў у юрыдычнай практыцы, удзяліў асаблівую ўвагу дзейнасці судовай сістэмы БССР.

На сустрэчы было вырашана ў рамках дагавора аб творчым супрацоўніцтве ўмацоўваць сувязі паміж міністэрствам юстыцыі і юрыдычным факультэтам у галіне абагульнення практыкі, выпрацоўкі навуковых рэкамендацый. Была адзначана неабходнасць звярнуць павышаную ўвагу на падрыхтоўку кадраў для судовай сістэмы рэспублікі.

М. ЧУДАКОЎ,
дацэнт.

### ВЕЧАР ДРУЖБЫ

адбыўся на філалагічным факультэце. Ён быў прысвечаны 39-й гадавіне заснавання ГДР. «Чырвоная зорка Кастрычніцкай рэвалюцыі дапамагае нам у барацьбе за мір» — спявалі юнакі і дзяўчаты з ГДР, будучыя выкладчыкі рускай мовы, а пакуль — стажоры, што вучацца на філфаку. Яны расказалі савецкім сябрам аб сваёй краіне і выказалі словы ўдзячнасці і любві да Савецкай Беларусі, якая стала для іх другой радзімай.

Віншавалі нямецкую моладзь са святам студэнты іншых замежных краін: Конга, Мадагаскара. Тым самым яшчэ раз было пацверджана: няма для дружбы моўных перашкод, розная мова зразумела народам, калі гучыць заклік да міру і ўзаемаразумення.

С. ШАПРАН.
студэнт філалагічнага факультэта.

## Кожную навуковую распрацоўку — на ўзровень новых патрабаванняў навукова-тэхнічнага прагрэсу!

***Зварот калектыву фізічнага факультэта да факультэтаў і навуковых падраздзяленняў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна***

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ! Па ўсёй краіне шырока разгорнута падрыхтоўка да XXVII з'езда КПСС. Выконваючы рашэнні красавіцкага і кастрычніцкага (1985 г.) Пленумаў ЦК КПСС, працоўныя нашай краіны ідуць насустрач гэтай падзеі вялікай палітычнай значнасці, праяўляючы клопаты аб справах грамадства і дзяржавы, разгортваюць барацьбу за ўмацаванне парадку і арганізаванасці. КПСС сфармулiравала канцэпцыю паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на базе навукова-тэхнічнага прагрэсу. Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў адзначаў, што пярэдняя лінія барацьбы за паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу праходзіць сёння цераз навуку. Патрабуецца яе рашучы паварот да патрэб грамадскай вытворчасці, хутчэйшае развіццё фундаментальнай навукі з мэтай стварэння тэарэтычных асноў прынцыпова новых відаў тэхнікі і тэхналогіі.

Гэтыя ўстаноўкі партыі непасрэдна датычацца і нас, работнікаў вышэйшай школы. На нарадзе ў ЦК КПСС указвалася на неабходнасць больш поўнага выкарыстання рэзерваў у сістэме вышэйшай адукацыі, значнага павелічэння аб'ёму навуковых даследаванняў у вышэйшай школе.

Калектыў супрацоўнікаў фізічнага факультэта ўспрыняў указанні партыі па паскарэнню развіцця навуковых даследаванняў у ВНУ як неадкладную і важнейшую задачу. Значныя поспехі факультэта за адзінаццатую пяцігодку. Большая частка навуковых даследаванняў праводзілася па важнейшай тэматыцы. Створаны шэраг новых прылад і матэрыялаў для народнай гаспадаркі, праведзены фундаментальныя даследаванні па актуальных напрамках сучаснай навукі. Высокая ацэнка нашых дасягненняў — прэмія Савета Міністраў СССР, дзве прэміі Ленінскага камсамола БССР, залаты медаль ВДНГ СССР, якіх удастоены супрацоўнікі факультэта. Навуковыя распрацоўкі па гаспадарча-дагаворнай тэматыцы даюць штогод эканамічны эфект больш за пяць мільёнаў рублёў пры затратах 2,3 мільёна рублёў. Пашырыліся сувязі факультэта з вядучымі прамысловымі прадпрыемствамі і ўстановамі АН БССР. Мы валодаем вялікім навуковым патэнцыялам — на факультэце працуюць 9 дактароў і каля 100 кандыдатаў навук, ёсць сучасная лабараторная база.

Аднак, прааналізаваўшы дасягнутае і нашы магчымасці, мы бачым, што рэзервы для развіцця навуковых даследаванняў у нас ёсць, і немалыя. Яшчэ не ўсе спецыялісты факультэта з поўнай аддачай удзельнічаюць у выкананні НДР, ёсць дробныя работы, якія прыводзяць да распылення сіл і сродкаў, не ў поўнай меры выкарыстоўваюцца магчымасці кааперацыі кафедраў і лабараторый пры рашэнні буйных навуковых праблем. Патрабуе далейшага ўдасканалення матэрыяльная база, неабходна шырэй выкарыстоўваць вылічальную тэхніку.

Мы лічым сваім абавязкам працаваць так, каб кожная навуковая распрацоўка выконвалася па актуальнай тэматыцы і на фундаментальным узроўні, а яе вынікі эфектыўна выкарыстоўваліся ў народнай гаспадарцы і для далейшага развіцця навуковых даследаванняў. Мы павінны больш аператыўна рэагаваць на патрэбы народнай гаспадаркі, канцэнтрыраваць намаганні кафедраў і лабараторый пры рашэнні найбольш актуальных праблем, дабівацца высокай выніковасці навуковай работы ўсіх супрацоўнікаў.

Мы павінны і надалей развіваць сувязі факультэта з прамысловымі прадпрыемствамі, інстытутамі АН БССР, шырэй удзельнічаць у выкананні комплексных праграм. Інтэнсіфікацыя навуковых даследаванняў павінна адбіцца і на якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, зближэнні навучання з канкрэтнымі праблемамі народнай гаспадаркі. Улічваючы патрабаванні часу, мы будзем настойліва ўдасканальваць лабараторную базу, шырэй укараняць у практыку навуковых даследаванняў вылічальную тэхніку, ствараць апаратуру і сродкі аўтаматызацыі НДР.

Як неабходную ўмову нашай першаступеннай задачы — павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, мы разглядаем далейшае пашырэнне і інтэнсіфікацыю навукова-метадычнай работы, накіраванай на распрацоўку новых эфектыўных форм і метадаў навучання.

На факультэце распрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы па рэалізацыі гэтых задач. Іх канчатковая мэта — зрабіць кожную навуковую распрацоўку адпаведнай сучасным патрабаванням.

Для паспяховага ажыццяўлення намечанай праграмы ёсць усе магчымасці. Справа за нашай канкрэтнай работай. Поспех залежыць ад нашага зацікаўленага і паўсядзённага ўдзелу ў рашэнні пастаўленых задач, змястоўнага, а не фармальнага падыходу да іх.

Мы звяртаемся да факультэтаў, навуковых падраздзяленняў нашага універсітэта з заклікам вызначыць свой актыўны ўдзел у рэалізацыі планаў партыі па паскарэнню навукова-тэхнічнага прагрэсу, ініцыятыўна, па-партыйнаму страсна змагацца за іх рэалізацыю, працаваць пад дэвізам: «Кожную навуковую распрацоўку — на ўзровень новых патрабаванняў навукова-тэхнічнага прагрэсу!» Паспяховае ажыццяўленне гэтай задачы стане нашым рэальным укладам у справу паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

*Зварот прыняты на прафсаюзнай справаздачна-выбарнай канферэнцыі калектыву фізічнага факультэта.*

# ТРЫВАЛАСЦЬ ЭНТУЗІЯЗМУ

**ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ юрыдычнага факультэта налічвае 169 камуністаў. Большасць выкладчыкаў і кожны восьмы студэнт факультэта—члены КПСС. Створана і працуе 14 партыйных груп: 7 — на кафедрах, 5 — на курсах і 2 — у інтэрнатах, дзе жывуць студэнты-юрысты.**

*Паспяховая дзейнасць партыі, рост актыўнасці камуністаў непарыўна звязаны з далейшым паляпшэннем работы пярвічных партыйных арганізацый. З'яўляючыся палітычным ядром працоўных калектываў, яны закліканы ўсямерна садзейнічаць спалучэнню палітыкі партыі з жывой творчасцю мас.*
*(З праекта новай рэдакцыі Праграмы КПСС).*

ПАРТЫЙНУЮ групу мы разглядаем як асноўнае звяно партыйнай арганізацыі факультэта. Ад таго, як будуць працаваць партгрупы, у многім залежыць поспех нашай работы. Таму партыйнае бюро факультэта сур'ёзна падышло да правядзення вясной гэтага года справаздачна-выбарнай кампаніі ў партгрупах кафедраў і курсаў. Партгрупоргамі выбраны камуністы, якія па сваіх дзелавых і асабістых якасцях адпавядаюць патрабаванням, якія прад'яўляюцца сёння да партыйных кіраўнікоў.

**На сходах партгруп рэгулярна заслухоўваюцца справаздачы камуністаў аб выкананні імі патрабаванняў Статута КПСС. Такія справаздачы мы разглядаем як адну з эфектыўных форм павышэння адказнасці камуністаў за даручаную справу. За мінулы навучальны год на партыйных сходах заслуханы справаздачы 56 членаў і кандыдатаў у члены КПСС.**

Вялікую ўвагу партыйнае бюро факультэта ўдзяляе рабоце кафедраў. Практычна кожная кафедра на працягу навучальнага года заслухоўваецца на пасяджэнні партбюро па таму ці іншаму пытанню. Справаздачы кафедраў аб стане палітыка-выхаваўчай, вучэбнай і навуковай работы перыядычна выносяцца на партыйныя сходы.

**На факультэце трывала увайшло ў практыку правядзенне сумесных пасяджэнняў партыйнага бюро і савета факультэта. Такое пасяджэнне, напрыклад, адбылося 30 жніўня гэтага года, на якім былі падведзены вынікі мінулага навучальнага года і вызначаны задачы калектыву факультэта па дастойнай сустрэчы XXVII з'езда КПСС.**

Дэканатам сумесна з партбюро факультэта распрацаваны перспектыўны план падрыхтоўкі і абароны доктарскіх дысертацый на бліжэйшыя дзесяць гадоў. З задавальненнем можна адзначыць, што ў апошнія гады на факультэце стала больш актыўна весціся работа па падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Пачынаючы з 1982 года — штогод абараняецца адна доктарская дысертацыя. Сёння на факультэце з вучонымі ступенямі і званнямі працуе 80 працэнтаў выкладчыкаў ад агульнай колькасці навукова-педагагічных работнікаў, у тым ліку 12 прафесараў, дактароў навук і 42 дацэнты, кандыдаты навук.

**На сумесным пасяджэнні дэканата і партыйнага бюро факультэта зацверджаны комплексны план удасканалення якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай юрыдычнай адукацыяй да 1990 года. Гэты план ахоплівае пытанні павышэння эфектыўнасці і якасці вучэбнага працэсу, удасканалення камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі, развіцця навуковых даследаванняў.**

**На партыйных сходах у мінулым навучальным годзе абмяркоўваліся пытанні далейшага паляпшэння партыйнага кіраўніцтва камсамолам, задачы калектыву факультэта ў святле рашэнняў красавіцкага (1985 г.) Пленума ЦК КПСС, аб рабоце куратараў акадэмічных груп і іх ролі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе.**

Дэканат, партбюро і камітэт камсамола факультэта практыкуюць такую форму заахвочвання лепшых студэнтаў, як накіраванне лістоў падзякі іх бацькам. У 1984—1985 навучальным годзе такіх пісем было накіравана больш за 140. Выкарыстоўваюцца і іншыя формы маральнага заахвочвання студэнтаў. Усё гэта дае станоўчыя вынікі.

**Па выніках летняй экзаменацыйнай сесіі 75 працэнтаў студэнтаў дзённай формы навучання здалі экзамены толькі на «добра» і «выдатна». Добры прыклад адносін да вучобы паказала 1-я група цяперашняга трэцяга курса, якая заняла першае месца ва універсітэце і ўзнагароджана паездкай у Ленінград.**

**За апошнія гады значна ўзрасла сацыяльная актыўнасць камуністаў факультэта. У мінулым навучальным годзе камуністы факультэта прынялі актыўны ўдзел у прапагандзе Закона СССР аб працоўных калектывах, новага антыалкагольнага заканадаўства. Каля 70 студэнтаў факультэта працуюць на грамадскіх пачатках у праваахоўных органах Мінска.**

Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва юрыдычны факультэт ва універсітэце заняў у 1983 годзе 2-е месца, у 1984 — раздзяліў 2—3 месцы.

Дасягнутыя поспехі не падстава для самазаспакаення, тым больш, што гэта ўжо поспехі ўчарашняга дня. Суадносячы зробленае з магчымасцямі, патрэбна адзначыць, што ў нас ёсць яшчэ нявыкарыстаныя рэзервы, а таксама ўпушчэнні і недахопы.

**Выпускнікам юрыдычнага факультэта нярэдка даводзіцца мець справу з людзьмі, якія маюць маральныя хібы. Таму студэнт-юрыст павінен быць палітычна сталым, маральна чыстым. Разам з тым пэўная частка студэнтаў юрыдычнага факультэта ўхіляецца ад удзелу ў грамадскім жыцці, не хвалюецца за інтарэсы факультэта. Тут ёсць над чым папрацаваць дэканату, кафедрам, партбюро і іншым грамадскім арганізацыям факультэта. І словам, і справай мы павінны выхоўваць нашых студэнтаў у духу высокай сацыялістычнай грамадзянскасці.**

Сёння важна не толькі тое, як працуе (вучыцца) і паводзіць сябе камуніст, але і наколькі актыўна ён змагаецца з недахопамі, дабіваецца агульнага паляпшэння спраў. Павышэнне сацыяльнай актыўнасці студэнцкай моладзі—сёння прадмет асобага клопату партыйнай арганізацыі факультэта.

**У палітыка-выхаваўчай рабоце са студэнцкай моладдзю ёсць у нас і элементы фармалізму. Асобныя мерапрыемствы праводзяцца дзеля справаздачы. Лепш было б праводзіць іх менш, але рабіць гэта па-дзелавому, каб яны западалі ў душу нашым студэнтам. Мы не павінны захапляцца паперамі. Усе сілы павінны быць аддадзены жывой рабоце са студэнтамі.**

**Істотны недахоп у палітыка-выхаваўчай рабоце заключаецца і ў тым, што яна яшчэ недастаткова індывідуалізавана, не заўсёды звернута да канкрэтнага чалавека, нярэдка носіць групавы характар. Гэта зніжае яе эфектыўнасць. Кожнага студэнта мы павінны навучыць жыць і працаваць па-камуністычнаму. Гэты дэвіз не прыгожая фраза, а рэальнае патрабаванне сённяшняга дня.**

Рыхтуючыся да дастойнай сустрэчы XXVII з'езда КПСС, мы павінны ўжо зараз прыводзіць у дзеянне ўсе рэзервы далейшага павышэння эфектыўнасці і якасці вучэбна-выхаваўчага працэсу.

В. ЦІХІНЯ,
дэкан юрыдычнага факультэта,
член партбюро.

## ДЭЛЕГАТЫ КАНФЕРЭНЦЫІ



*ЦЕСНЫЯ СУВЯЗІ супрацоўніцтва існуюць паміж партыйным бюро і камітэтам камсамола механіка-матэматычнага факультэта. Часта на пасяджэннях партбюро абмяркоўваюцца пытанні камсамольскага жыцця. Члены партбюро — пастаянныя ўдзельнікі мерапрыемстваў, якія праводзіць камітэт камсамола. Зладжаныя дзеянні ў рабоце, вопыт, падтрымка старэйшых таварышаў даюць станоўчыя вынікі. Камсамольская арганізацыя факультэта адна з лепшых ва універсітэце.*

***НА ЗДЫМКУ:** дэкан факультэта М. І. Юрчук, сакратар партбюро Л. П. Прымачук, члены камітэта камсамола І. Шарашкіна і В. Кобец, старшыня прафбюро факультэта І. Добыш абмяркоўваюць апошнія дакументы партыі.*

**Ці спрабавалі вы калі-небудзь выпрабаваць на цвёрдасць корпус уласнага гадзінніка? Вядома — не? Дзе вы знойдзеце дарослага чалавека, якому не трывае́цца разбітацца з такой нятаннай пакуль і карыснай рэччу? Так, дарослага не знойдзеце, але вось адзін мой маленькі сябра усё ж дадумаўся да такога. І што вы думаеце, разрэзаў шкляны ліст на дзве палоны... бацькавым гадзіннікам. На вялікае і прыемнае здзіўленне таты, хлапец, па-першае, ніколькі не парэзаўся. Па-другое, на корпусе гадзінніка не засталося ніводнай драпіны.**

## БДУ — НАРОДНАЙ ГАСПАДАРЦЫ

# ПРЫГОЖЫ ЦВЁРДЫ АЛЮМІНІЙ

*Савецкая навука заклікана займаць вядучыя пазіцыі па асноўных напрамках навукова-тэхнічнага прагрэсу, знаходзіць эфектыўныя і своечасовыя вырашэнні перспектыўных і бягучых вытворчых і сацыяльна-эканамічных праблем.*
*(З праекта новай рэдакцыі Праграмы КПСС).*

НОВЫ ГАДЗІННІК бацька гарэзлівага хлопчыка купіў не так даўно. А корпус гэтай рэчы (лёгкі, прыемнага колеру) зроблены на мінскім заводзе «Электроніка».

Улічыў вашы пярэчанні, згодны, алюмініем ніхто яшчэ шкло не рэзаў. Не рэзаў, пакуль у Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна (кафедра неарганічнай хіміі, НДІ фізіка-хімічных праблем, СКТБ) не распрацавалі і не ўкаранілі ў вытворчасць электрахімічныя працэсы, якія забяспечваюць на паверхні вырабаў з алюмінію і яго дэфармуемых сплаваў абаронча-дэкаратыўныя аксідныя пакрыцці. На алюмінію тут яшчэ навучыліся рабіць надпісы і малюнкі, якія валодаюць дастаткова высокім супраціўленнем зносу і ўстойлівасцю да сонечнага і атмасфернага ўздзеяння.

**Не будзем засяроджваць увагу на дэталях. Гэта — клопат спецыялістаў. Тых, каго зацікавіць тэхналогія, мы накіроўваем па вышэй названаму адрасу. А вось на некаторых выніках гэтай вялікай навуковай работы А. Л. Белановіча, В. П. Савенка, В. В. Каляды, Т. Л. Махкевіча і многіх іншых супрацоўнікаў універсітэта пагаварыць, напэўна, патрэбна.**

**Адразу зазначым, што цвёрдасць, якую атрымаў пасля тэхналагічнай апрацоўкі алюміній — гэта самастойны цікавы вынік працяглага і клапатлівага пошуку універсітэцкіх вучоных. Галоўная ж задача стаяла перад імі некалькі іншага характару. А іменна — афарбоўка металу ў шырокую гаму колераў. Задача гэта была вырашана. Але не будзем забягаць наперад.**

Кіраўнік групы кафедры неарганічнай хіміі Георгій Лукіч Шчукін узначальвае даследаванне, яму і слова:

**— Толькі не думайце, калі ласка, што мы зрабілі нейкае навуковае адкрыццё. Паняцце аб электронна-хімічнай апрацоўцы металу людзі мелі ўжо даўно, яшчэ ў 40-я гады нашага стагоддзя. За апошнія гады тэхналогію распрацавалі ў ЗША, Японіі, ФРГ... Узнікла праблема і перад намі. Як вядома, запасы медзі, латуні, нержавусталі вычарпальныя, ды і каштуюць гэтыя металы даволі дорага. А чым іх замяніць? Звярнуліся да алюмінію.**

**Сёння кожны школьнік назаве вам асноўныя знешнія рысы гэтага металу: белы, з характэрным металічным бляскам. Але ўсіх гэтых уласных якасцей алюмінію сёння ўжо не хапае, каб шырока выкарыстоўваць яго ў прамысловасці, каб зрабіць тавары народнага спажывання адпаведнымі самым высокім стандартам.**

**У многім гэта залежыць ад знешняга выгляду вырабу, ад устойлівасці і прывабнасці абліцовачнага матэрыялу. Напрыклад, мінскі радыёпрыёмнік «Акіян» пачалі ахвотна купляць за мяжой. Лічу, што не апошнюю ролю адыграла тое, што цяжкі метал на корпусе прыёмніка замянілі алюмініем, які апрацаваны па нашай тэхналогіі, укаранёнай у ВА «Гарызонт». Корпус транзістара не выгарае, не выцвітае, не паддаецца карозіі. Больш таго, яго магчыма цяпер пераапрануць у разнастайныя колеры.**

**Вось такія праблемы і перспектывы падахвоцілі нас сем гадоў назад прыступіць да сур'ёзных даследаванняў па дадзенай тэме.**

Цяжка зараз гаварыць, як прайшлі гэтыя сем гадоў. Георгій Лукіч не любіць расказваць пра навуковы гераізм і самаадданую працу. Даследчая работа заўсёды цяжкая, часам няўдзячная, будзённая. Скажам так: супрацоўнікі добрасумленна выконвалі свае службовыя абавязкі. Спрабавалі, эксперыментавалі, вынаходзілі... А потым — выконвалі гаспадарчы дагавор, які быў заключаны з ВА «Гарызонт» на ўкараненне ў вытворчасць дзвюх аўтаматычных ліній па апрацоўцы алюмінію. Шмат было радасці, калі атрымаўся першы ліст. І горкіх хвілін, і адчаю, калі нечакана перастала працаваць ванна з электралітам афарбоўкі.

Гартаю папку з заявамі розных прадпрыемстваў нашай краіны на ўкараненне ў іх вытворчасць гэтай новай тэхналогіі. Заяў ужо каля васьмідзесяці, геаграфія іх адрасоў даволі шырокая: Масква, Рыга, Новасібірск, Смаленск, Пскоў... Толькі вось заяўкі гэтыя задавольваюцца пакуль што яшчэ не ўсе. Мяркуйце самі: укараненне патрабуе самага непасрэднага кантролю з боку універсітэцкай групы, навучання людзей на месцах. А ў групе сёння працуюць 10 чалавек. 10 чалавек на ўсю краіну?!

А што эканамічны эфект ад укаранення ў вытворчасць такой тэхналогіі? Паўторым, справа новая, і пакуль разлічыць гэтую лічбу, тым больш для тавараў народнага спажывання, даволі нялёгка. Але Г. Л. Шчукін спадзяецца, што хутка гэта можна будзе зрабіць з дапамогай поршня для цыліндра рухавіка ўнутранага згарання. Гэта якраз тое, над чым працуе сёння група.

**— Калі паверхню поршня рабіць з нашага алюмінію,— сцвярджае Георгій Лукіч,— магутнасць рухавіка значна ўзрасце.**

Што ж, вельмі хацелася б, каб рухавік прыдбаў у хуткім часе такую важную пераўтвораную дэталь.

**А сёння прадукт новай тэхналогіі ўжо прымянялі пры рэстаўрацыйных работах, у алюміній апрануліся радыёпрыёмнікі «ВЭФ» і «Акіян», гадзіннікавыя механізмы схаваліся пад надзейным корпусам, плануецца яго выкарыстанне для абліцоўкі Мінскага метрапалітэна...**

Такім чынам, зараз не будзем хаваць нашы гадзіннікі ад малых дзяцей. Няхай гуляюць, забаўляюцца. Усё роўна не падрапаюць. Гэта — жарт. А калі сур'ёзна, то сцвярджэнне, вынесенае ў загаловак, сёння ўжо далёка не пазбаўлена логікі.

У. БЕРАЖКОЎ,
наш кар.

# СКРОЗЬ ПРЫЗМУ ЛІЧБАЎ

** Найбольш буйнымі на партыйнай канферэнцыі з'яўляюцца дэлегацыі гістарычнага факультэта — 104 чалавекі, юрыдычнага факультэта — 87, фізічнага — 57, філалагічнага — 46, хімічнага і механіка-матэматычнага факультэтаў — па 43.*

** Дэлегатамі партыйнай канферэнцыі выбраны: 1 акадэмік і 2 члены-карэспандэнты Акадэміі навук БССР, 89 дактароў навук і прафесараў, 400 кандыдатаў навук і дацэнтаў. Сярод дэлегатаў лаўрэатаў Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій СССР — 5, Дзяржаўнай прэміі БССР — 5, прэміі Ленінскага камсамола Беларусі — 4, прэміі Саюза журналістаў СССР — 3. Маюць ганаровыя званні заслужанага дзеяча навукі, навукі і тэхнікі, работніка вышэйшай школы, культуры — 32 дэлегаты.*

** За заслугі перад Радзімай 278 дэлегатаў канферэнцыі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, 104 — Ганаровай граматай і Граматай Вярхоўнага Савета БССР.*

** Дэлегатамі партыйнай канферэнцыі з'яўляюцца 132 удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, камуністы, якія са зброяй у руках заваявалі Перамогу, абаранялі гонар, свабоду і незалежнасць нашай Радзімы.*

** У ліку дэлегатаў 1 кандыдат у члены ЦК КПБ, 3 члены гаркома, 5 членаў райкома партыі, 24 сакратары партыйных арганізацый, 32 члены парткома, 106 партгрупоргаў.*

** Сярод дэлегатаў 1 дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, 7 дэпутатаў абласных, гарадскіх і раённых Саветаў народных дэпутатаў, 12 дэлегатаў канферэнцыі з'яўляюцца членамі камітэта камсамола, 12 — членамі прафсаюзных камітэтаў супрацоўнікаў і студэнтаў.*

** Актыўны ўдзел у вучэбнай, навуковай і грамадскай рабоце універсітэта прымаюць жанчыны. З агульнага ліку дэлегатаў канферэнцыі жанчыны складаюць 22 працэнты. Сярод іх — 8 дактароў навук і прафесараў, 97 кандыдатаў навук і дацэнтаў.*

** Дэлегатамі канферэнцыі выбрана 76 студэнтаў, якія паспяхова сумяшчаюць выдатную вучобу з актыўным удзелам у грамадскім жыцці, у працоўным семестры.*

# УМАЦОЎВАЦЬ БАЯВІТАСЦЬ РАДОЎ

У МЭТАНАКІРАВАНАЙ ідэйна-выхаваўчай рабоце хімічнага факультэта важнае месца адводзіцца росту і ўмацаванню радоў партыйнай арганізацыі, рабоце з маладымі камуністамі.

***Партыя клапоціцца аб тым, каб на ўсіх участках поплеч з выпрабаванымі кадрамі старэйшых пакаленняў працавалі, набіраліся вопыту, набывалі неабходную загартоўку маладыя, перспектыўныя работнікі.***
***(З праекта новай рэдакцыі Праграмы КПСС).***

За апошнія тры гады партыйная арганізацыя прыняла ў свае рады 13 членаў КПСС, лепшых прадстаўнікоў студэнтаў, аспірантаў і навуковых супрацоўнікаў факультэта і НДІ ФХП. Усе камуністы і кандыдаты ў члены КПСС пастаянна знаходзяцца ў полі зроку партыйнай арганізацыі, старэйшых таварышаў-камуністаў. Так, кожны малады член партыі рэгулярна трымае справаздачу на партбюро як аб праходжанні кандыдацкага стажу, так і аб выкананні канкрэтнага партыйнага даручэння. Камуністы, якія рэкамендавалі камсамольцаў і беспартыйных у рады членаў КПСС, з'яўляюцца сапраўднымі настаўнікамі маладых камуністаў і кандыдатаў у члены КПСС, сістэматычна цікавяцца вучобай, поспехамі ў ГПП і г. д.

Студэнты-камуністы ў сваю чаргу аказваюць дапамогу ў арганізацыі працоўных спраў, грамадска-палітычнай атэстацыі, арганізацыі камсамольскіх сходаў, рабоце камітэта камсамола, паказваюць прыклад выдатнай вучобы. Так, малады камуніст У. Белянкоў выдатна закончыў хімфак, зараз — супрацоўнік НДІ ФХП, актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці факультэта і свайго інстытута. Кандыдат у члены КПСС Д. Орлік — таксама выдатнік вучобы, камсамольскі важак студэнтаў-хімікаў. Адказна ставіцца да арганізацыі грамадска-палітычнай практыкі малады камуніст В. Вінарскі, падключаючы да гэтага важнага мерапрыемства камсамольцаў, прафсаюзных актывістаў.

Разам з тым, работа з маладымі камуністамі патрабуе сёння большай актывізацыі. Яе неабходна ўдасканальваць з мэтай выпрацоўкі ў маладых камуністаў большай ініцыятывы, пачуцця новага, партыйнай адказнасці ў вучобе і вытворчай дзейнасці, жадання і ўмення перадаваць гэтыя навыкі ў калектыве, несці слова партыі ў масы. З гэтай мэтай у комплексным плане падрыхтоўкі спецыялістаў на факультэце прадугледжаны цыкл мер па актывізацыі палітычнай і навуковай дзейнасці студэнтаў, выкарыстанне палітычных і педагагічных навыкаў непасрэдна ў працэсе вучобы, грамадскай і працоўнай дзейнасці.

**Л. ЧАБЛАКОВА,**
намеснік сакратара партбюро хімічнага факультэта.

## ДЭЛЕГАТЫ КАНФЕРЭНЦЫІ



*Партгрупа кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў — ініцыятар многіх плённых спраў. Па ініцыятыве камуністаў распрацавана новая методыка правядзення сацспаборніцтва, што дало магчымасць значна палепшыць выніковасць дзейнасці кафедры. Супрацоўнікі толькі за апошнія два гады падрыхтавалі 7 манаграфій, абаронена 14 кандыдацкіх дысертацый.*

# ВУЧЫЦЬ актыўнасці

***Грамадскія і самадзейныя арганізацыі займаюць важнае месца ў палітычнай сістэме нашага грамадства. Новыя, яшчэ больш высокія патрабаванні да іх работы прад'яўляюцца ў святле рашэнняў красавіцкага і кастрычніцкага (1985 г.) Пленумаў ЦК КПСС. Грамадскія і самадзейныя арганізацыі павінны стаць надзейнымі памочнікамі партыйных арганізацый у правядзенні ідэалагічнай і палітыка-выхаваўчай работы, у мабілізацыі працоўных калектываў на рашэнне задач удасканалення развітога сацыялізму.***

***Партыя надае першараднае значэнне павышэнню ролі грамадскіх арганізацый — важных звенняў сістэмы сацыялістычнага самакіравання народа.***
***(З праекта новай рэдакцыі Праграмы КПСС).***

ВЫКОНВАЮЧЫ гістарычныя рашэнні XXVI з'езда КПСС, наступных Пленумаў ЦК КПСС, партыйны камітэт, партыйныя арганізацыі факультэтаў і падраздзяленняў універсітэта надаюць вялікую ўвагу рабоце камсамольскіх, прафсаюзных, іншых грамадскіх арганізацый і фарміраванняў. На партыйных сходах кафедраў і факультэтаў, пасяджэннях партбюро і парткома ўсё часцей абмяркоўваюцца пытанні дзейнасці той ці іншай арганізацыі, прымаюцца канкрэтныя пастановы па ўдасканаленню стылю і метадаў работы. Аб гэтым сведчыць і пасяджэнне парткома, што адбылося ў верасні мінулага года, на якім разглядалася пытанне аб паляпшэнні партыйнага кіраўніцтва грамадскімі арганізацыямі універсітэта.

Як жа ідуць справы сёння ў такіх масавых грамадскіх арганізацыях універсітэта, як ДТСААФ, таварыствы аховы прыроды, аховы помнікаў гісторыі і культуры, аматараў кнігі і некаторых іншых фарміраванняў? Яны ўносяць свой уклад у справу падрыхтоўкі спецыялістаў, у камуністычнае выхаванне студэнцкай моладзі. Кожнае з іх будуе сваю работу пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі на аснове шырокай самадзейнасці і ініцыятывы, у кантакце з прафсаюзнымі, камсамольскімі і іншымі арганізацыямі. Але асаблівую ўвагу патрэбна засяродзіць на тых недахопах, якія маюць месца ў рабоце масавых грамадскіх арганізацый.

Для ўсіх масавых грамадскіх арганізацый універсітэта характэрна слабая арганізацыйная і прапагандысцкая работа (у меншай ступені гэта датычыць ДТСААФ), адарванасць ад студэнцкіх калектываў, слабая інфармаванасць членаў арганізацый аб мэтах і задачах таварystваў, адсутнасць на месцах ініцыятыўнага кіраўніцтва і моцнага актыву, няўменне і нежаданне цікава праводзіць мерапрыемствы, якія ў большасці праходзяць фармальна, не маюць ніякага выхаваўчага значэння.

Ва універсітэце масавыя грамадскія арганізацыі ахопліваюць большую частку студэнтаў і супрацоўнікаў. Большасць членаў плацяць толькі ўзносы. Хаця Статуты ўсіх грамадскіх фарміраванняў маюць на ўвазе не толькі ўплату ўзносаў, але і работу пярвічнай арганізацыі. Відаць, каб падняць аўтарытэт грамадскіх фарміраванняў, пытанне аб членстве неабходна вырашаць толькі ў адпаведнасці са Статутам.

Большасць грамадскіх арганізацый праводзяць сваю работу сіламі тых падраздзяленняў універсітэта, прафесійная дзейнасць якіх звязана з задачамі грамадскай арганізацыі. Напрыклад, такімі базавымі падраздзяленнямі таварыства Чырвонага Крыжа з'яўляюцца паліклініка, кафедра грамадзянскай абароны, у меншай ступені біялагічны факультэт; таварыства аховы прыроды — геаграфічны і біялагічны факультэты; таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры — гістарычны і філалагічны факультэты; таварыства аматараў кнігі — філалагічны факультэт і факультэт журналістыкі. І гэта ў цэлым правільна. Аднак, замыкаючыся на такіх падраздзяленнях, іх сіламі выконваючы работу, грамадскія арганізацыі да членаў астатніх падраздзяленняў прад'яўляюць адзінае патрабаванне — своечасовую ўплату ўзносаў, якая і з'яўляецца крытэрыем ацэнкі іх дзейнасці. Гэтым заахвочваецца бяздзейнасць большасці членаў масавай арганізацыі і зніжэнне яе аўтарытэту.

Многія недахопы ў дзейнасці грамадскіх арганізацый можна растлумачыць слабай работай па кіраўніцтву імі з боку партыйных арганізацый факультэтаў, кафедраў і партыйных груп. Аналіз работы партыйных арганізацый сведчыць аб слабай увазе іх да праблем арганізацыйнага і грамадска-палітычнага характару масавых фарміраванняў. Большасць партбюро факультэтаў сваю работу па кіраўніцтву грамадскімі арганізацыямі абмяжоўвае ў асноўным работай з камсамолам і прафсаюзнай арганізацыяй. Некалькі менш у параўнанні з імі надаюць увагу таварыству «Веды» і ДТСААФ. Што датычыць астатніх грамадскіх арганізацый, то іх работа фактычна выпадае з поля зроку партбюро факультэтаў. Так, у 1984 годзе на фізічным, біялагічным і хімічным факультэтах неаднаразова на пасяджэннях партбюро заслухоўваліся пытанні аб рабоце камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый, ДТСААФ, таварыства «Веды». Затое на іншыя грамадскія арганізацыі яны нават не звярнулі ўвагі.

Наколькі вялікая роля партыйнага ўздзеяння на работу грамадскага фарміравання сведчыць такі факт. ДТСААФ юрыдычнага факультэта ў 1983 годзе ва універсітэце займала толькі адзінаццатае месца. Партыйнае бюро факультэта прааналізавала прычыны такога становішча, вызначыла шэраг мер па аказанню дапамогі камітэту ДТСААФ, умацаванню яго актыву, павышэнню галоснасці ў рабоце. І ўжо ў 1984 годзе юрыдычны факультэт па абаронна-масавай рабоце перамясціўся на трэцяе месца.

Партыйным бюро факультэтаў і падраздзяленняў патрэбна сур'ёзна падыходзіць да падбору і расстаноўкі кіруючых кадраў грамадскіх арганізацый. Не сакрэт, што часта на пасады старшынь масавых таварыстваў рэкамендуюцца безыніцыятыўныя, нявопытныя і не правераныя ў грамадскай рабоце студэнты і супрацоўнікі. Адначасова не патрэбна забываць актывістаў грамадскіх арганізацый, падтрымліваць іх, ствараць умовы для важнай і неабходнай работы.

Карэнных змен патрабуе арганізатарская работа партыйных груп па актывізацыі дзейнасці цэхавых грамадскіх арганізацый. Скажам прама, што ў многіх студэнцкіх групах, лабараторыях, на кафедрах адсутнічаюць адказныя за работу такіх таварыстваў, як аховы прыроды, Чырвоны Крыж, аховы помнікаў гісторыі і культуры, АСВОД і інш. Тут уся практычная дзейнасць гэтых грамадскіх арганізацый зводзіцца да збору ўзносаў. А грамадскія арганізацыі могуць быць і добрай базай для праходжання грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў. Працуючы ў групах у якасці адказных за тое ці іншае таварыства, студэнты маглі б атрымліваць навыкі арганізатарскай работы, растлумачваючы мэты і задачы таварыства — навыкі прапагандысцкай работы.

Прайшоўшы пасля прынятай партыйным камітэтам пастановы па пытанню далейшага паляпшэння партыйнага кіраўніцтва грамадскімі фарміраваннямі год паказаў, што партыйныя бюро падраздзяленняў універсітэта значна актывізавалі сваю работу з масавымі грамадскімі арганізацыямі. Гэту станоўчую тэндэнцыю неабходна замацаваць, каб у бягучым навучальным годзе грамадскія арганізацыі універсітэта канструктыўна перабудавалі сваю работу і занялі свае месцы ў агульным працэсе камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі.

**С. МУЛЯРЧЫК.**

# ПАЗІЦЫЯ — наступальная

***КПСС будзе актыўна садзейнічаць павышэнню дзейснасці народнага кантролю. Работу працоўных у органах народнага кантролю яна разглядае як важную форму развіцця іх палітычнай сталасці і актыўнасці ў абароне народных інтарэсаў, выхавання дзяржаўнага падыходу да справы, гаспадарскіх адносін да народнага здабытку.***
***(З праекта новай рэдакцыі Праграмы КПСС).***

Значнае месца ў рабоце КНК займаюць пытанні, звязаныя з паляпшэннем умоў быту студэнтаў, захаванасцю сацыялістычнай маёмасці, эканоміі і беражлівасці электраэнергіі, гаруча-змазачных матэрыялаў.

Умацаванне ўзаемадзеяння КНК з партыйнай камісіяй, камісіямі кантролю за дзейнасцю адміністрацыі, прафсаюзнай і камсамольскай арганізацыямі, саветам па прафілактыцы правапарушэнняў дазволіла значна павысіць эфектыўнасць работы кантрольных органаў універсітэта.

Важнае месца ў рабоце КНК і кантрольных камісій парткома займаюць пытанні працоўнай і выканаўчай дысцыпліны ў падраздзяленнях універсітэта, а таксама расстаноўка кадраў і эфектыўнасць іх работы. За 1984—1985 гады было праведзена 9 праверак такой накіраванасці. Вынікі іх абмяркоўваліся на нарадах рэктарата, савеце універсітэта, партыйным актыве.

КНК наклаў спагнанні чатыром кіраўнікам служб АГЧ за слабы кантроль за расстаноўкай кадраў і эфектыўнасцю іх работы, за безадказныя адносіны да работы, грубыя парушэнні пры афармленні справаздачнай дакументацыі.

КНК сумесна з саветам прававога выхавання і прафілактыкі правапарушэнняў узяў пад кантроль выкананне ў БДУ імя У. І. Леніна рашэнняў партыі і ўрада, накіраваных на барацьбу з п'янствам і алкагалізмам. На сумесным пасяджэнні КНК і савета разгледжаны вынікі праверкі работы па барацьбе з п'янствам на факультэтах і ў падраздзяленнях універсітэта ў 1984 і ў першым паўгоддзі гэтага года. Было ўстаноўлена, што кіраўніцтва і некаторыя партарганізацыі падраздзяленняў недастаткова ўвагі ўдзяляюць рабоце ў гэтым напрамку: парушаюцца тэрміны разгляду паведамленняў праваахоўных органаў і паведамлення іх аб прынятых да парушальнікаў мерах. Не заўсёды аб'яўленыя меры ўздзеяння выконваюцца (НДЧ, юрфак, факультэт радыёфізікі і электронікі, мехмат). Назіраюцца выпадкі, калі паведамленні аб парушэннях разглядаюцца фармальна, а асноўная мера пакарання — абмеркаванне (гараж, АГЧ, кафедра фізвыхавання). Звенні кіравання, прымаючы меры ўздзеяння да парушальнікаў, не заўсёды своечасова інфармуюць адно другое і дзейнічаюць узгоднена (аддзел кадраў НДЧ не заўсёды інфармаваны аб мерах, прынятых да правапарушальнікаў, таму што матэрыялы на навуковых супрацоўнікаў разглядаюцца на кафедрах і факультэтах).

КНК абавязаў кіраўнікоў падраздзяленняў ліквідаваць адзначаныя недахопы і прыняць меры па безумоўнаму выкананню пастановы партыі і ўрада па барацьбе з п'янствам і алкагалізмам.

КНК універсітэта праводзіць вялікую метадычную работу па павышэнню актыўнасці народных кантралёраў, рэзультатыўнасці іх работы з тым, каб народныя кантралёры былі і надалей надзейнымі памочнікамі партыі і дзяржавы ў барацьбе за ажыццяўленне задач камуністычнага будаўніцтва.

**А. КАСПЯРОВІЧ,**
старшыня камітэта народнага кантролю універсітэта.

## ДЭЛЕГАТЫ КАНФЕРЭНЦЫІ



*ЯНЫ — студэнты-трэцякурснікі юрыдычнага факультэта. Добра вучацца, займаюцца спортам, любяць працаваць, дастойна носяць высокае званне камуніста Зоя Каляда і Дзмітрый Гарачка — члены партбюро, Уладзімір Ківель — адказны за работу групы «Пошук». Заусёды знаходзяць яны час, каб абмеркаваць праблемы студэнцкага жыцця.*

**Фота А. ВАЛОШЫНА.**

**Уменнем весці людзей за сабой, пераканаць і натхніць асабістым прыкладам — вось чым моцныя камуністы. Гэта іх абавязак, норма жыцця.**

# БЫЦЬ ПРЫКЛАДАМ

***Кожны камуніст абавязан быць узорам у працы і ў паводзінах, у грамадскім і асабістым жыцці. Ад таго, наколькі поўна праяўляецца авангардная роля камуністаў, у многім залежыць трываласць сувязей партыі з масамі, яе аўтарытэт у народзе.***

***(З праекта новай рэдакцыі Праграмы КПСС).***

— **КОЖНЫ З НАС**, камуністаў, да любой справы павінен падыходзіць з больш высокім пачуццём адказнасці, прынцыпова,— гаворыць Вольга Кадач, праўорг IV курса юрыдычнага факультэта, член партбюро.— Мы непасрэдна ажыццяўляем рашэнні партыйнай арганізацыі. Задача аблягчаецца тым, што, добра ведаючы сваіх сяброў-студэнтаў, разумееш, хто выканае канкрэтнае даручэнне лепш за іншых. Гэта, на мой погляд, найбольш важна ў нашай рабоце.

— На нашым факультэце 118 камуністаў-студэнтаў,— працягвае размову сакратар партбюро юрфака, дацэнт кафедры грамадзянскага і сямейнага права Валерый Мікалаевіч Гадуноў.— Есць з кім працаваць. Наша работа заключаецца не толькі ў падрыхтоўцы спецыялістаў, але і ў выхаванні чалавека палітычна адукаванага, сацыяльна актыўнага. Маладыя людзі прыходзяць да нас ужо ў нейкай ступені падрыхтаванымі. Але універсітэт — гэта больш высокая прыступка самастойнасці. Ен дае магчымасць удзельнічаць ва ўсіх сферах грамадскага жыцця. А стаць актыўным удзельнікам падзей без дапамогі і падтрымкі старэйшых, больш вопытных таварышаў, пад сілу далёка не кожнаму. І ў гэтых адносінах ролю камуніста цяжка пераацаніць.

З Валерыем Мікалаевічам нельга не згадзіцца. Камуністам многае павінна быць пад сілу. Ім даверавы найбольш складаныя і адказныя задачы. На юрфаку яны ўваходзяць у састаў прафбюро, студсавета. Больш за пяцьдзесят студэнтаў-камуністаў удзельнічаюць у камсамольскай рабоце. Есць, вядома, і пэўныя цяжкасці.

— Галоўная цяжкасць, напэўна, у тым,— гаворыць дэпутат гарсавета, староста III курса Аляксандр Дземяшкевіч,— што знаходзяцца людзі (і іх, на жаль, нямала), якія лічаць, што прыйшлі ва універсітэт толькі для таго, каб атрымаць дыплом. Яны і лекцыі наведваюць, і сесію здаюць добра і своечасова. Але існуе нейкі бар'ер, які аддзяляе асабістае жыццё ад усіх факультэцкіх клопатаў. Яны не хочуць разумець, што ў ВНУ атрымліваюць не толькі неабходныя для далейшай дзейнасці веды, але і даецца магчымасць выпрабаваць свае сілы ў рабоце з людзьмі. Ды і наогул цікавей становіцца жыць, калі нас недзе чакаюць з нецярпеннем. Каб адчуць гэта, патрэбна знайсці сябе ў грамадскай рабоце, убачыць у ёй неабходнасць і атрымаць задавальненне. Мы стараемся дапамагчы кожнаму знайсці сябе.

Перамены на факультэце адчувальныя. Гэта зразумела і з расказаў студэнтаў аб праведзеных вечарах адпачынку, конкурсах самадзейных артыстаў. Многае арганізаваць яны цяпер могуць самі. Значна палепшылася наведванне заняткаў, і як вынік — павялічылася паспяховасць. Прыкладам у вучобе з'яўляюцца камуністы. Апошнюю сесію 81 чалавек (з 118) здаў без троек. Гэта якраз яшчэ адно пацвярджэнне таго, што грамадскую работу можна паспяхова сумяшчаць з вучобай.

Апошнія гады факультэт з'яўляецца нязменным лідэрам сацыялістычнага спаборніцтва, а зводны факультэцкі будаўнічы атрад вось ужо чатыры гады запар лепшы ва універсітэце. І гэта не выпадкова, бо падрыхтоўцы да правядзення трэцяга працоўнага семестра тут надаецца вялікае значэнне. Пры вызначэнні кандыдатур камандзіраў і камісараў будаўнічых атрадаў кіраўніцтва і партыйнае бюро факультэта нязменна спыняюць свой выбар на студэнтах-камуністах. Тут ёсць магчымасць праверкі арганізатарскіх здольнасцей ва ўмовах больш цяжкіх, чым звычайныя. У будатрадзе чалавек на віду: і ў рабоце, і ў час адпачынку. Атрад імя М. Б. Осіпавай у гэтым годзе стаў адным з лепшых у Клецкім раёне.

— Спачатку здавалася, што нічога ў мяне не атрымаецца, хоць і дзяўчаты ўсе былі свае,— гаворыць камандзір СБА камуніст Таццяна Лук'яновіч,— але пачынаць цяжка заўсёды. Выручыў вопыт грамадскай работы. Ды і таварышы дапамаглі. А самым складаным было арганізаваць бесперабойны рытм працы.

Таксама з выдатнымі адзнакамі завяршылі работу на аб'ектах атрады «Рытм» (камандзір А. Дземяшкевіч), «Ісціна» (камандзір М. Варабей), «Няміга» (камандзір А. Папко). Хочацца яшчэ раз адзначыць, што камандзіры ўсіх пералічаных вышэй атрадаў — маладыя камуністы.

Як заўсёды збярэцца партбюро для абмеркавання справаздач камуністаў аб праведзенай рабоце, выслухаць прапановы аб тым, што яшчэ патрэбна зрабіць. Як сказалі мне самі студэнты, яны плануюць дапамагчы студэнцкаму клубу «Верасень», сумесна з камітэтам камсамола наладзіць яго работу так, каб ён зноў стаў для студэнтаў тым месцам, куды б хацелася прыйсці, дзе было б цікава. Упэўнены, што камуністы знойдуць шляхі для вырашэння гэтых і іншых задач.

**А. ВАЛЬВАЧОЎ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

# РАШАЮЧЫ ФАКТАР

***Партыя паслядоўна праводзіць лінію на выхаванне і падрыхтоўку свядомых, высокаадукаваных людзей, здольных як да фізічнай, так і разумовай працы, да актыўнай дзейнасці ў народнай гаспадарцы, у розных галінах грамадскага і дзяржаўнага жыцця, у сферы навукі і культуры.***

***(З праекта новай рэдакцыі Праграмы КПСС).***

**ВІДАЦЬ**, няма неабходнасці лішні раз гаварыць аб тым, што вучоба студэнтаў — галоўны клопат калектыву выкладчыкаў і супрацоўнікаў любой навучальнай установы. Патрабаванні часу ставяць перад сённяшнімі студэнтамі, а заўтрашнімі спецыялістамі задачу ўсямернага авалодвання каштоўнымі здабыткамі мінулых пакаленняў, памнажэння традыцый старэйшых таварышаў.

Акадэмічная работа знаходзіцца пастаянна ў полі зроку партыйнай арганізацыі факультэта. Дастаткова сказаць, што толькі на партыйным бюро чатыры разы за вучэбны год абмяркоўваўся стан акадэмічнай работы на асобных курсах. Асаблівую ініцыятыўнасць, паўсядзённы клопат у барацьбе за веды праяўляюць члены партыйнага бюро І. В. Шаблоўская і І. А. Рабчынская, намеснік дэкана М. М. Піпчанка, куратары многіх акадэмічных груп. Існуе цесны кантакт акадэмічных сектараў партбюро і камітэта камсамола з вучэбна-выхаваўчай камісіяй, саветам куратараў. На сумесных пасяджэннях ВВК і акадэмічных сектараў, часткова на партбюро былі заслуханы справаздачы 16 чалавек, якія дрэнна паспяваюць, маюць пропускі заняткаў па няўважлівых прычынах. Па рэкамендацыі партбюро і ВВК чатыры чалавекі былі адлічаны. Аднак гэта крайняя мера і без яе можна было абысціся, калі б ужо з першага курса, з першых дзён вучобы мы своечасова разгледзелі ў некаторых абыякавасць, інфантыльнасць. Думаецца, ёсць пралікі (а можа, і грубыя памылкі) і пры залічэнні некаторых абітурыентаў, у прыёме ўступных экзаменаў. Не вядома, як адказвала на ўступных экзаменах В. Невядомская, але «заваліць» у першую сесію ўсе 5 экзаменаў — такога на філфаку ніхто не можа прыпомніць. Яўнае непаразуменне адбылося і з залічэннем на першы курс Л. Сіверкай, якая ў дыктантах па рускай мове робіць па 80—90 памылак! Названыя прозвішчы ўжо не лічацца ў спісе студэнтаў, але іх увогуле там не павінна было быць.

Нягледзячы на вялікую колькасць сходаў, абмеркаванняў на самых розных узроўнях, стан вучобы па-ранейшаму не можа нас задаволіць. З кожным годам расце колькасць пропускаў заняткаў, выкладчыкі як агню баяцца пераді паслясвяточных дзён, назіраецца пасіўнасць пэўнай часткі студэнтаў да прадметаў будучай спецыяльнасці. Партыйнае бюро ў гэтай сувязі асаблівую ўвагу надае рабоце куратараў акадэмічных груп, іх актыўнаму ўдзелу ў фарміраванні прафесійнай самасвядомасці студэнтаў, ажыццяўленню кантролю за асноўнымі відамі работы студэнцкага мікракалектыву. Кожны член партыйнага бюро мае свой падшэфны курс, работа на якім з'яўляецца адным з галоўных партыйных даручэнняў. Мы імкнёмся асаблівую ўвагу ўдзяляць рабоце атэстацыйна-метадычных камісій па лініі грамадска-палітычнай практыкі, іх пастаяннай зацікаўленасці ў справах курса.

На факультэце працуе добры камсамольскі актыў — апора партыйнай арганізацыі і ўсяго калектыву. Шмат зроблена і робіцца актывам у справе ўмацавання дысцыпліны. Партыйнае бюро асноўную частку сваёй работы імкнецца перанесці ў нізавыя арганізацыі, іменна ў студэнцкую групу, на курс. «Праводзіць максімум часу ў маладзёжных калектывах, бываць не толькі на масавых мерапрыемствах, але і цікавіцца штодзённым жыццём,.. сканцэнтраваць намаганні на рабоце нізавых камсамольскіх арганізацый», — гэтага ад нас патрабуе Пастанова ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні партыйнага кіраўніцтва камсамолам і павышэнні яго ролі ў камуністычным выхаванні моладзі».

Стала добрым правілам, калі на кожны камсамольскі сход групы запрашаюцца камуністы, ветэраны факультэта. У сваю чаргу, студэнты далёка не гасцямі адчуваюць сябе на партыйных сходах, пры абмеркаванні асобных пытанняў на пасяджэннях партыйнага бюро.

Зараз у поўным разгары першы, асенне-зімовы семестр. У студэнцкіх аўдыторыях гартуецца, мацнее і набірае сілы маладая змена — спецыялісты, якім працаваць у XXI стагоддзі. Задача кожнага камуніста, кожнага выкладчыка — не шкадаваць ні сілы, ні часу для іх, добрым словам і яскравым прыкладам вучыць іх вучыцца, сеяць разумнае, добрае, вечнае.

**М. ПРЫГОДЗІЧ,**
**сакратар партбюро філалагічнага факультэта.**

## ДЭЛЕГАТЫ КАНФЕРЭНЦЫІ



• *АЛЕГ АНТОНАВІЧ ЛОЙКА, прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры філалагічнага факультэта заўсёды сярод моладзі. Закончыцца лекцыя па беларускай літаратуры, а ён ужо зноў спяшаецца на сустрэчу да студэнтаў. Запрасілі расказаць пра сваю творчасць, падзяліцца пісьменніцкім вопытам. Чакаюць пачынаючыя літаратары ў літаб'яднанні «Узлёт», якім кіруе Алег Антонавіч. Любоў да роднай літаратуры, глыбокае веданне яе мінулага і сучаснага, пошук асабістага пяра — усё гэта прывівае ў студэнтаў А. А. Лойка, выхоўвае ў іх сапраўдных літаратуразнаўцаў.*

**НА ЗДЫМКУ:** А. А. Лойка са студэнткамі III-га курса беларускага аддзялення філалагічнага факультэта Т. Петуховай, Г. Ракоца, Т. Піскун у час перапынку.

**Фота А. ВАЛОШЫНА.**

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

12 лістапада 1985 г.

Зак. 3158. АТ 13805.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ.